**КАНСТЫТУЦЫЙНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ І ІХ АБАРОНА**

**І.І.Пляхімовіч,** БДУ

У якасці асноўнага закона канстытуцыя прызначана адлюстроўваць і абараняць асноўныя каштоўнасці соцыуму, якія тым самым становяцца і канстытуцыйнымі каштоўнасцямі. Паняцце каштоўнасці фіксуе не проста аб’ектыўна існуючую з’яву, а дадатнае стаўленне (ацэнку) да яго з боку чалавека, групы асоб, арганізацыі, грамадства ў цэлым. Сучасная канстытуцыя павінна замацоўваць не толькі нацыянальныя (унутраныя), але і агульначалавечыя каштоўнасці. На прыхільнасць народа да агульначалавечых каштоўнасцей указана, напрыклад, у прэамбуле Канстытуцыі Беларусі.

Зыходнае і непасрэднае значэнне для даследавання канстытуцыйных каштоўнасцей мае частка першая артыкула 2 беларускай Канстытуцыі, паводле якой чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з’яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы. З дадзенага палажэння лагічна вынікае наяўнасць у грамадства (дзяржавы) і іншых, “менш высокіх” каштоўнасцей. Кампанентамі грамадства (яго сістэмы), апроч чалавека і другіх суб’ектаў, у навуцы лічацца таксама матэрыяльныя і духоўныя даброты, працэсы. На ролю каштоўнасцей соцыуму не прэтэндуюць толькі апошнія. Зыходзячы з Канстытуцыі, чалавек (яго інтарэсы) у каштоўнасным аспекце мае вяршэнства над іншымі суб’ектамі (грамадскімі аб’яднаннямі, уключаючы партыі, гаспадарчымі і другімі арганізацыямі, дзяржавай як часткай грамадства), а таксама астатнімі кампанентамі грамадства, якія з’яўляюцца каштоўнасцямі, – матэрыяльнымі і духоўнымі дабротамі. (У артыкулах 51 і 54, напрыклад, гаворыцца аб каштоўнасцях культуры, духоўнай спадчыне і іншых нацыянальных каштоўнасцях). Разглядаемы канстытуцыйны прынцып забараняе ахвяраваць чалавекам, яго правамі і свабодамі дзеля іншых каштоўнасцей, няхай гэта будзе вялікае навуковае адкрыццё, мастацкі шэдэўр альбо тэхнічная вынаходка. Мяркуем, аднак, што ў змесце артыкула 2 гаворка ідзе, па сутнасці, аб суадносінах чалавека не толькі з іншымі кампанентамі сістэмы грамадства, але і з грамадствам цалкам. У гэтым пераконвае гістарычнае і тэлеалагічнае (мэтавае) тлумачэнне нормы. Зыходзячы з такога разумення, інтарэсы чалавека (прыватныя інтарэсы) павінны пераважаць інтарэсы грамадства (публічныя інтарэсы). Ускладаемыя ж на чалавека абявязкі скіраваны перш за ўсё на абарону правоў другіх такіх жа асоб. У той жа час перавага, прыярытэт інтарэсаў чалавека не азначаюць іх поўнага панавання, інакш існаванне грамадства было б немагчымым. Чалавек нясе пэўныя абавязкі і перад грамадствам (дзяржавай) (артыкулы 54–57), правы індывіда могуць абмяжоўвацца ў выпадку грамадскай неабходнасці (артыкул 23).

Замацаванне артыкулам 23 Канстытуцыі мэт абмежавання правоў чалавека таксама дазваляе акцэнтаваць увагу на канстытуцыйных каштоўнасцях. Нягледзячы на абвяшчэнне чалавека, яго правоў і свабод найвышэйшай каштоўнасцю, Канстытуцыя абараняе таксама іншыя каштоўнасці, да ліку якіх адносяцца дзяржава і грамадства ў цэлым. Чатыры з пяці мэт у артыкуле 23 адлюстроўваюць грамадскія даброты, а адна мэта (правы і свабоды іншых асоб) – індывідуальныя даброты.

Ажыццяўляючы абарону канстытуцыйнага ладу, паводле часткі трэцяй артыкула 1 Канстытуцыі, дзяржава абараняе пры гэтым і сябе, бо з’яўляецца элементам канстытуцыйнага ладу. Абарона Рэспублікі Беларусь прызнаецца абавязкам таксама яе грамадзян (артыкул 57). Неабходнасць абароны Рэспублікі Беларусь, канстытуцыйныя функцыі беларускай дзяржавы, уключаючы важнейшую з іх – забеспячэнне правоў і свабод грамадзян, не пакідаюць сумненняў у тым, што дзяржава прызнаецца каштоўнасцю. Павагай павінен карыстацца не толькі кожны грамадзянін, але і сама дзяржава – гаворка ж ідзе аб дэмакратычнай сацыяльнай і прававой дзяржаве. Паказальны ў гэтых адносінах артыкул 1 польскай Канстытуцыі: “Рэспубліка Польшча ёсць агульная каштоўнасць усіх яе грамадзян”. Такімі меркаваннямі абгрунтоўваецца і ўстанаўленне заканадаўствам адказнасці за дзеянні супраць дзяржавы, яе органаў і службовых асоб. У Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь маецца цэлы раздзел “Злачынствы супраць дзяржавы і парадку ажыццяўлення ўлады і кіравання”. У ім прадугледжваецца адказнасць за здраду дзяржаве, шпіянаж, тэрарыстычны акт, дыверсію, заклікі да дзеянняў, скіраваных на шкоду бяспецы Рэспублікі Беларусь, яе суверэнітэту, тэрытарыяльнай недатыкальнасці, знявагу прадстаўніка ўлады, здзек з дзяржаўных сімвалаў і іншыя дзеянні. У гэтым жа рэчышчы трэба разглядаць замацаваны ў канстытуцыях цэлага шэрагу краін абавязак грамадзян быць вернымі сваёй дзяржаве. Адпаведна Крымінальнаму кодэксу Польшчы, “хто публічна зневажае нацыю або Рэспубліку Польшчу, падлягае пакаранню …”.

Каштоўнаснае значэнне ўласціва і дзяржаве ў вузкім сэнсе як сукупнасці органаў улады (апарату ўлады). Усе дзяржаўныя органы, што створаны (сфарміраваны) і дзейнічаюць на аснове Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю другіх нарматыўных актаў, з’яўляюцца каштоўнасцю. Гэтым ні ў якім разе не закранаецца прынцып найвышэйшай каштоўнасці чалавека, яго правоў і свабод. Паміж абаронай правоў чалавека і паўнамоцтваў дзяржаўных органаў няшмат агульнага; разам з тым, пастаноўка пытання аб магчымых паралелях не пазбаўлена сэнсу. Канстытуцыя юрыдычна ахоўвае органы ўлады, іх службовых асоб ад гвалту, умяшання ў іх паўнамоцтвы, замахаў на рэпутацыю, другіх супрацьпраўных дзеянняў з боку іншых дзяржаўных органаў, індывідаў, арганізацый, замежных краін, абавязвае грамадзян Беларусі ўдзельнічаць у забеспячэнні функцыянавання і абароне органаў улады. Так, любыя дзеянні па змяненню канстытуцыйнага ладу і дасягненню дзяржаўнай улады гвалтоўнымі метадамі, а таксама шляхам іншага парушэння законаў падлягаюць пакаранню (артыкул 3), дзяржаўныя органы ў межах сваіх паўнамоцтваў самастойныя (артыкул 6), абмежаванне правоў і свабод чалавека дапускаецца, сярод іншага, у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, а значыць, і бяспекі дзяржаўных органаў (артыкул 23), грамадзяне Беларусі абавязаны прымаць удзел у фінансаванні дзяржаўных органаў (артыкул 56) і абароне Рэспублікі Беларусь (артыкул 57), Прэзідэнт надзяляецца недатыкальнасцю, яго гонар і годнасць ахоўваюцца законам (артыкул 79), парламентарыі карыстаюцца недатыкальнасцю пры выказванні сваіх меркаванняў і рэалізацыі сваіх паўнамоцтваў (артыкул 102), суды і суддзі пры ажыццяўленні правасуддзя незалежныя, якое-небудзь умяшанне ў дзейнасць суддзяў па выкананню правасуддзя недапушчальнае і цягне адказнасць па закону (артыкулы 60, 110), Генеральны пракурор і ніжэйстаячыя пракуроры незалежныя ў ажыццяўленні сваіх паўнамоцтваў (артыкул 127).

Падпісаная ў межах Савета Еўропы Канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод, вызначаючы парадак абмежавання гэтых правоў, прадугледжвае некалькі мэт такога абмежавання, звязаных з абаронай дзяржаўных органаў. Акрамя мэт, непасрэдна замацаваных і Канстытуцыяй Беларусі, варта звярнуць увагу на адлюстраванне пунктам 2 артыкула 10 Канвенцыі “абароны рэпутацыі або правоў іншых асоб” і “забеспячэнне аўтарытэту і непрадузятасці правасуддзя”. Фармулёўкі ўказаных мэт дазваляюць распаўсюджваць адпаведныя нормы і на рэпутацыю (аўтарытэт) органаў улады, уключаючы суды. Беларуская Канстытуцыя ў дачыненні да дзяржаўных органаў (службовых асоб) змяшчае норму аб ахове гонару і годнасці толькі Прэзідэнта (артыкул 79). Аднак з сэнсу канстытуцыйных нормаў вынікае, што яны

дазваляюць прадугледжваць ахову рэпутацыі і другіх органаў улады (службовых асоб). Сродкам такой аховы з’яўляецца і абмежаванне правоў чалавека. Хаця ў артыкуле 23 не сказана аб абароне рэпутацыі органаў улады, яна ахопліваецца замацаванымі тут мэтамі нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маральнасці.